**Андрэеўская В.Д.,** *дацэнт*

# БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ПЕСНЯ ЯК СРОДАК СТЫМУЛЯЦЫІ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Зносіны з мастацтвам - адзін з самых моцных спосабаў атрымання станоўчых эмоцый. У наш час выкарыстанне яго сродкаў у розных галінах чалавечай дзейнасці пашыраецца. Найбольш дзейсным з усіх мастацтваў з'яўляецца музыка: яе гукі маюць чароўную сілу і могуць падпарадкоўваць сабе ўсю жывую і, калі верыць легендам, нежывую прыроду. Значныя фізіялагічныя зрухі адбываюцца пад уздзеяннем музыкі і ў арганізме чалавека: яна паляпшае каардынацыю рухаў і мышачную свабоду, дапамагае ўстанавіць і захаваць выразны рытм працы, стварае добры настрой. Таму, дзякуючы даступнасці ў век НТР, функцыянальная музыка шырока прымяняецца ў якасці фактару палягчэння і ўпрыгожвання той або іншай дзейнасці.

У сувязі са шматлікімі паведамленнямі аб станоўчым уплыве музыкі не толькі на фізічную актыўнасць, але і на стан псіхікі, мыслення, інтэлектуальную дзейнасць а ў апошнія гады ўзрастае цікавасць да яе выкарыстання і ў якасці стымулятара разумовай працы. Як субдамінантны раздражняльнік, музыка

ўзмацняе работу панаючага ачага ў ЦНС, павышае ўзбуджальнасць зрокавага і слыхавога аналізатараў, паляпшае гемадынамічныя паказчыкі і памяць, адцягвае надыход стомленасці, павышае ўзровень станоўчых эмоцый. Таму да яе звярнуліся некаторыя педагогі сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў з мэтай зрабіць вучэбны працэс больш эфектыўным. Пры абследаванні было зафіксавана паляпшэнне шэрага аб'ектыўных паказчыкаў стану ЦНС студэнтаў, даныя ж іх апытання дзіўныя: 90-93% - за прымяненне музычнага фону ў час заняткаў. Прычым найбольш жаданая музыка - спакойная і меладычная.

Шмат прыгожых сардэчных мелодый можна знайсці ў беларускім фальклоры. Гэта такія народныя песні, як «Ой, рана на Йвана», «А ў полі вярба», «Дубочак зялёненькі», «Ах, чаго я сохну», «А ў лесе цёмным, «Як хацела мяне маці», «Купалінка», «Шумныя бярозы» (музыка народная, словы Я.Купалы), «Зорка Венера» (музыка народная, словы М.Багдановіча) і іншыя жамчужыны беларускай культуры і мастацтва.

Ціхае гучанне іх у час заняткаў вядзе да дабратворнага ўплыву не толькі на стан здароў'я і разумовай працаздольнасці навучэнцаў, але і да гуманізацыі самога вучэбнага працэсу, што выклікана сілай ачышчальнага і ўзвышанага ўздзеяння народнага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ